# Дасягненні ўніверсітэтаў у галіне якасці адзначыў урад

***У сераду, 15 лютага, на ўрачыстай цырымоніі ў Нацыянальнай бібліятэцы былі абвешчаны пераможцы конкурсу на суісканне прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці 2011 года. Характэрна, што прэмію атрымалі ў тым ліку і вышэйшыя навучальныя ўстановы.***

►►► 2 стар.

# Дасягненні ўніверсітэтаў у галіне якасці адзначыў урад

◄◄◄ 1 стар.

Высокай урадавай узнагароды на гэты раз удастоены 14 айчынных арганізацый за ўкараненне высокаэфектыўных метадаў кіравання якасцю і забеспячэнне на гэтай аснове выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі і паслуг. Яны прадстаўляюць машынабудаўнічую, электратэхнічную, харчовую, фармацэўтычную, будаўнічую, транспартную галіны, лёгкую прамысловасць, а таксама сферу адукацыі.

Такім чынам, сярод адукацыйных устаноў прэміі ўдастоены Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі і Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт.

Яшчэ 14 прадпрыемстваў пацвердзілі званне лаўрэата, а чатыры арганізацыі сталі дыпламантамі. Сярод дыпламантаў — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

У рамках конкурсу на суісканне прэміі ўрада праводзяцца конкурсы "Лепшы менеджар па якасці" і "Лепшая дыпломная і навукова-даследчая работа студэнтаў у галіне менеджменту і кантролю якасці". Сярод лепшых менеджараў па якасці — Алена Леанідаўна Разава, начальнік цэнтра ўніверсітэцкага менеджменту Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. А пераможцамі студэнцкага конкурсу сталі Кацярына Ухіна, прадстаўніца Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, Кацярына Кручко і Таццяна Голуб, студэнткі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Падчас цырымоніі ў Нацыянальнай бібліятэцы пераможцаў асабіста павіншаваў міністр адукацыі Сяргей Маскевіч.

Нагадаем, што конкурс на суісканне прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці ўпершыню адбыўся ў 1999 годзе. За мінулы час (уключаючы 2011 год) яго лаўрэатамі сталі 205 арганізацый. У гэтым годзе ва ўсіх намінацыях за права стаць лаўрэатам прэміі змагаліся 43 арганізацыі. Намінацыі былі наступнымі: "Вытворчасць нехарчовых тавараў бытавога прызначэння"; "Вытворчасць харчовых тавараў і сельскагаспадарчай прадукцыі"; "Вытворчасць прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння"; "Аказанне паслуг і выкананне работ"; "Аказанне паслуг і выкананне работ у галіне будаўніцтва".

Прааналізаваўшы вынікі конкурсу 2011 года, у Дзяржаўным камітэце па стандартызацыі адзначаюць, што сярод пераможцаў ёсць прадпрыемствы, якія выпускаюць унікальную ў рэспубліцы прадукцыю, прымяняюць тэхналогіі, якія не маюць аналагаў у СНД, укараняюць сучасныя рэсурсазберагальныя рашэнні. Дарэчы, усе арганізацыі, якія прымалі ўдзел у конкурсе 2011 года, маюць сертыфікаваныя сістэмы менеджменту якасці па ISO 9001.

**Аляксандр АНДРЫЯНАЎ.**